сістэма, арыгінальная распрацоўка айчынных навукоўцаў, што не мае аналагаў ні ў СНД, ні ў Усходняй Еўропе.

Да мерапрыемства была прымеркаваная выстава кніг, адпаведных тэматыцы новага выдання. У прэзентацыі бралі ўдзел навукоўцы НАН Беларусі, прадстаўнікі Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, Мінскага абласнога і гарадскога камітэтаў прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя.

✓**16 студзеня** ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі прайшоў **Дзень літаб'яднання «Маладняк»**, у межах якога былі зладжаныя круглы стол «Маладняковускімі крокамі» і святочная імпрэза.

Да 100-годдзя згуртавання пісьменнікаў арганізаваны рэспубліканскі праект «На хвалі часу, у плыні жыцця», што рэалізуецца ў 2019 – 2023 гг. Ініцыятарамі яго стварэння сталі Нацыянальная бібліятэка Беларусі, Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры, Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва і Выдавецкі дом «Звязда» (часопіс «Маладосць»).

Пад час круглага стала абмеркавалі ролю літаб'яднання «Маладняк» у станаўленні беларускай літаратуры, а таксама вынікі першага года рэалізацыі і перспектывы праекта, прагучалі даклады, прысвечаныя дзейнасці і спадчыне «маладняковуцаў».

Пад час святочнай імпрэзы прадставілі рэспубліканскі праект і віртуальны праект «На хвалі часу, у плыні жыцця» і яго новыя раздзелы. На вечарыне выступілі пісьменніца, настаўніца, літаратуразнаўца Ганна Севярынец, сайд-праект «Naka Piano» (Анастасія Шпакоўская і Ірына Кліменка), былі прадстаўленыя музычныя і літаратурныя нумары ў выкананні народнага літаратурнага тэатра «Жывое слова».

Завяршылася імпрэза ў музеі кнігі адкрыццём выставы, прысвечанай аб'яднанню «Маладняк» і яго сябрам – В. Маракову, П. Трусу, М. Хведаровічу, А. Бабарэку і іншым юбілярам 2019 – пачатку 2020 г.

✓**17 студзеня** ў Нацыянальным гістарычным музеі Рэспублікі Беларусь адкрытая **выстаўка ізраільскага фотамастака Барыса Равіча «Вера. Людзі. Краіны»**. Наведнікі могуць пазнаёміцца з персанальнай выставай фотаработ майстра, што раней была разгорнутая ў Маскве, у музеях Мінска, Гомеля і Гродна. Час захаваны на фотаздымках, што нарадзіліся ў Вене, Мінску, Тбілісі, Барселоне, Парыжы. Аўтар – уладальнік прэміі Гаўдзі, прыза міжнароднай кампаніі «Оранж», прэміі Булата Акуджавы, медалёў і дыпломаў больш як 500 міжнародных выставаў. Вядомы фатограф працуе вялікімі серыямі («Тэрор», «Лаўка», «Людзі і храмы», «Жанчына ў вялікім горадзе»).

✓У Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры ў межах праекта «Вяртаем забытыя імёны» **17 студзеня** прайшло **адкрыццё літаратурна-мастацкай часовай экспазіцыі «Біблія для народа 1692 – 1696 гг. Васіля Кораня»**. Упершыню шырокаму колу наведнікаў прадстаўленыя рэканструяваныя аркушы першай гравіраванай Біблії для народа ў малюнках, створанай нашым земляком – беларускім майстрам-разьбяром па дрэве Васілём Коранем з мястэчка Дуброўна.

